Тамара Нуждзіна

# МАГІЛЁЎШЧЫНА Ў МАСТАЦКІМ ВЫЯЎЛЕННІ АЛЯКСЕЯ ПЫСІНА

Яшчэ ў сярэдзіне 20-х гг. мінулага стагоддзя вялікі Купала ў вершы «О так! Я – пралетар!..» трывожна пісаў аб той небяспецы, якую несла грамадству палітыка нігілістычнага стаўлення да праблемы нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Сапраўды, не можа быць «Бацькаўшчынай цэлы свет»[1], калі не шануецца, не спазнаецца гісторыя, духоўныя скарбы радзімых куточкаў. Толькі прыгарнуўшыся душой і памяццю да свайго, такога пагляднага, людскага, гожага, беларус XXI ст. здольны арганічна ўвайсці ў сусветную прастору быцця краін, народаў, цывілізацый. Лірыка Аляксея Пысіна якраз і вызначаецца магутным патэнцыялам уздзеяння на выхаванне ў беларусаў, якія жывуць у век глабальных змен ва ўспрыманні сучаснікам духоўна-маральных і культурна-гістарычных арыенціраў, пачуцця нацыянальнай самадастатковасці.

Маштабнасць творчых адкрыццяў пісьменніка, паэта-журналіста з Магілёўшчыны, сілу, жывучасць і значнасць яго мастацкага слова акрэсліў у свой час дасведчаны, надзелены выключным эстэтычным густам крытык Р. Бярозкін. У артыкуле з трапнай назвай «Рух каранёў» літаратуразнаўца паставіў паэта ў адзін рад з М. Гусоўскім, Цёткай, М. Багдановічам, А. Куляшовым, а яшчэ з тымі, хто з прычыны трагічнага наканавання не мог разгарнуць свой талент на поўную моц (М. Грамыка, Ю. Таўбін, М. Сурначоў і інш.)[2].

Зразумець гэты «рух каранёў» і яго вытокі дапамагае запіс А. Пысіна ў журналісцкім блакноце, на які спасылаецца празаік В. Карамазаў у эсэ

[1] *Купала Я.* Поўны збор твораў : у 9 т. Мінск, 1997. Т. 4 : Вершы, пераклады 1915–1929. С. 124.

[2] *Бярозкін Р.* Рух каранёў // Постаці: артыкулы пра паэтаў / Р. Бярозкін. Мінск, 1971. С. 276.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

«Трагедыі лірычны эпілог»: «Янка Купала не меў дыплома аб заканчэнні ўніверсітэта. Але ёсць купалаўскі ўніверсітэт паэзіі. У ім тры факультэты: матчынай мовы, народнай песні, народнага жыцця. Гэтыя тры прадметы Купала вывучаў усё жыццё»[1].

Сваю мадэль быцця беларуса ў прасторы і часе А. Пысін выбудоўвае, спасцігаючы мастацкую значнасць тых прадметаў, якія так рупна вывучаў усё жыццё Я. Купала. У той жа час пысінская канцэпцыя існавання чалавека ў свеце і Сусвеце – гэта не толькі праявы народнага жыцця, абставін, побытавых дэталей, народнай эстэтыкі, этыкету. Магутна ў мастацкім свеце А. Пысіна валадарыць прыродная стыхія. Навакольнае асяроддзе, у якім жывуць, працуюць, змагаюцца і адыходзяць у вечнасць героі паэта, нясе выразныя рэгіянальныя адзнакі.

Першыя зборнікі «Наш дзень» (1951) і «Сіні ранак» (1959) сведчаць пра настойлівае жаданне аўтара весці чытача ў дарагі паэту і яго лірычнаму герою «бацькоўскі край»[2]. Праўда, рэгіянальныя прыкметы гэтага краю носяць больш намінатыўны характар (Сож, Слаўгарад, Крамянка, Магілёў, Днепр), а пейзажны малюнак не набывае пакуль той асаблівай канкрэтна-мясцовай выразнасці, за якой адчуваецца глыбіня мастацкай думкі, драматызм быцця блізкага, роднага свету, за якім бясконцасць, што вядзе, з аднаго боку, у глыбіню стагоддзяў, з другога – у касмічную нясканчонасць той сапраўднасці, носьбітамі якой былі ўсе, каго згадвае А. Пысін у пранізліва балючых і па-філасофску маштабных радках, напісаных напрыканцы жыцця. У пару відушчай мудрасці і творчай сталасці.

За вёскаю –
вёска другая,
Ні даху, ні вокнаў, ні шыб.
Зямля, для усіх дарагая,
На дзвесце паверхаў углыб.

Пад крыжам –
пяску тыя жмені,
Што вам на павекі ляглі,
Аратыя, ткаллі і жнеі,
Шаўцы, цесляры, кавалі[3].

У вершы гучыць думка аб аўтарскім разуменні сваёй творчай наканаванасці: менавіта яму выпаў лёс гаварыць не толькі ад імя франтавога

[1] *Карамазаў В.* Трагедыі лірычны эпілог // Зб. тв. : у 2 т. / А. Пысін. Мінск, 1989. Т. 1 : Вершы. С. 7.
[2] *Пысін А.* Збор твораў : у 2 т. Т. 1. С. 69.
[3] Там жа. С. 380.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

пабрацімства, але і ад імя тых пакаленняў вясковага люду Магілёўшчыны, што даўно адышлі ў нябыт, пакінуўшы ў спадчыну жыццёвы вопыт і веды (без дыплома вучылі і лячылі), а таксама – «досціп народны, і мудрасць, і песню, і смех»[1]. Ёсць у згаданым вершы і яшчэ адно пісьменніцкае тлумачэнне таго, што гэтак часта ў яго паэзіі гучаць галасы продкаў. Разам і паасобку. Жывых і нежывых. Далёкіх і блізкіх. І калі не сказаць пра ўсё і ўсіх у сваім часе, то пазней

Ніхто не праявіць партрэты
І прозвішчы праз вякі,
Вялікія нашы паэты,
Музыкі і спевакі[2].

Здзейсненае А. Пысіным бачыцца гэткім жа значным і важным у фарміраванні ментальнасці сучаснага беларуса, як і тое, што рабіў У. Караткевіч, вяртаючы сваім чытачам гісторыю ахвярнага змагання продкаў за волю і чалавечую годнасць. І калі пісьменнік-рамантык, пісьменнік-рыцар слугаваў свайму народу, адкрываючы яму ў стагоддзях былую славу, трагічную веліч і сілу духу продкаў, то А. Пысін дзень за днём, год за годам узнаўляе ў гуках, колерах, пахах дынаміку рэальных карцін жыцця тых, чыя прысутнасць адбілася ў зямных кругах і каляінах, на пругкіх струменях вечнасці. Узнаўляе самае дарагое, што спрадвеку завецца родам, коранем, гняздом, родняй зямлёй, Бацькаўшчынай.

У 1968 г. выйшаў чарговы зборнік лірыкі А. Пысіна «Пойма». Ужо самой назвай падкрэслена неад'емная рыса краявідаў Магілёўшчыны. А яшчэ гэта важны сэнсава-вызначальны вобраз у агульнай мастацкай сістэме пісьменніка. Бліжэй да сярэдзіны 60-х гг. мінулага стагоддзя паэтычныя вобразы, якія ў той або іншай ступені звязаны з воднай стыхіяй, сталі сутнасным кодам пысінскай лірыкі. І былі для таго сур'ёзныя падставы на самых розных узроўнях – геаграфічна-рэгіянальным, генетычна-спадчынным, культурна-эстэтычным, міфалагічна-гістарычным. Ваду шанавалі, вадзе пакланяліся язычнікі-прашчуры. Нездарма, малюючы партрэт Беларусі, майстар эсэ Я. Сіпакоў у кнізе «Зялёны лісток на планеце Зямля» як першаступеннае ў аблічча краіны вызначае, напрыклад, наступнае: зямля – людзі – мова – вада. І толькі пасля ўсё астатняе. Па словах эсэіста, нашы далёкія продкі «пакланяліся вадзе – рэкам, азёрам, студням. Пакланяліся як Багам. Чаго не разумелі і чаму здзіўляліся нашы госці: “славяне вероваша кладзезем и рекам”»[3].

---

[1] *Пысін А.* Пазнач. твор. С. 381.
[2] Там жа. С. 380.
[3] *Сіпакоў Я.* Зялёны лісток на планеце Зямля: партрэт Беларусі : эсэ. Мінск, 2010. С. 52.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

На працягу бадай што двух дзесяцігоддзяў А. Пысін імкнуўся стварыць такую сістэму мастацкай вобразнасці, у якой па-філасофску глабальна, псіхалагічна праўдзіва, эмацыянальна, устрывожана адбілася і дайшла б да сучаснікаў і наступнікаў галоўная, «вузлавая», на думку паэта, ісціна: толькі той варты наймення Чалавек, хто тугім вузлом свайго жыцця і памяці прывязаны да радзінных берагоў. Да лугу і поля, да травы і травінкі, да лесу і кожнага дрэва. Да зямлі ва ўсіх яе ўборах. І, вядома, да вады. Да рэк і рэчак, рачулак, ручайкоў і рэчачак. Можна нагадаць не адзін дзясятак вершаў, у якіх паэт стварае іх аблічча, перадае характар, нораў («Проня», «Я зноў іду у свет мне мілы...», «Вятры і дождж – такая блытаніна...», «Адчыняйце вокны – гром пялёснуў...», «Вада», «Балада пра каску», «Пячэрскі парк», «Рачулка рыжая ў пасцелі...», «Няма той рэчкі, што з вірамі...», «Калі б вясне, Дняпру і чайцы...» і інш.). Не адзін раз згадваецца, напрыклад, Проня, з якой у Пысіна звязаны трагічныя падзеі франтавой эпапеі 1943 г. І праз гады яна помніцца «светлай да самага дна» ў сваёй непакоры чужынцам[1], бачыцца «не вузкай і не мелкай»[2], чуецца над ёю «чмяліны малінавы бас»[3], а яшчэ яна і сімвал нераможнасці жыцця.

Нельга не звярнуць увагу і на тое, што не толькі значныя плошчай басейна рэкі Магілёўшчыны (Сож, Днепр) з'яўляюцца пастаяннымі мастацкімі вобразамі ў паэтычным свеце А. Пысіна. Прыгадвае паэт маленькую (усяго 18 км даўжынёй) рачулку Дубравенку, гэты «шнурочак Дняпра»[4], і рачулку, што плёскала пад вербамі, і тую рэчку, «што з вірамі»[5], і тую, «што люляла», якую час «у травы перашыў»[6]. А. Пысін захапляе дакладнасцю малюнка і ўменнем адчуваць душу прыроды, калі стварае такі, напрыклад, вобраз:

> Рачулка рыжая ў пасцелі
> Заснула, як дзяўчо.
> І душна ёй пасля мяцеліц –
> Паказвае плячо[7].

Не абыходзіў сваёй увагай паэт азёры і ставкі, крыніцы і калодзежы. Былі і на гэта прычыны. Гісторыя быцця беларуса ў прасторы і часе гаворыць пра яго асобае стаўленне да калодзежаў і крыніц: іх шанавалі як найвялікшую каштоўнасць, як самае святое. Навучыўся гэтаму і А. Пысін,

---

[1] *Пысін А.* Пазнач. твор. С. 62.
[2] Там жа. С. 182.
[3] Там жа.
[4] Там жа. С. 195.
[5] Там жа. С. 235.
[6] Там жа.
[7] Там жа. С. 205.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

прайшоўшы школу народнай эстэтыкі, народнага этыкету: калодзежы і крыніцы павінны быць заўсёды чыстымі, жывымі. Вучыла гэтаму маці, вучылі суседзі, вяскоўцы, землякі. Народная памяць захавала і перадала ў спадчыну нашчадкам не адну легенду пра цудадзейную сілу крынічнай вады. Не мог не ведаць паэт і журналіст А. Пысін, якому па рэдакцыйных справах даводзілася бываць у розных кутках Магілёўшчыны, пра гаючую сілу вады, напрыклад, з Сіняй крыніцы, што каля Слаўгарада.

Вада, такім чынам, жыве ў паэтычных радках А. Пысіна ў самых розных праяўленнях – ад расінкі, дажджавой кроплі ці навальнічных ліўняў да рачной прасторы, што мкне не толькі ўдалячынь, але і ў нябёсы. Нават «бярозка ў лесе ў сваім леце // Рачулачкай у неба льецца»[1]. Да ўсяго, што звязана з воднай стыхіяй, яшчэ дадаюцца чаўны і лодкі, паромы і плыты, вадзяныя млыны і масты, гаці, пераправы, берагі... і так аж да самай вялікай вады – мора, разумець душу якога вучылі лірычнага героя А. Пысіна ўсё тыя ж рачулкі, што бралі пачатак з глыбінь Магілёўскай зямлі. І нават звычайныя начоўкі, у якіх купалі немаўля, былі яго першым досведам асваення воднай прасторы:

Начоўкі вузкія, вады ў іх мала,
Ўсяго па локаць матчын глыбіні;
Ды морам,
Самым першым адміралам
І першым берагам былі яны[2].

У межах заяўленай праблемы цікава паназіраць і за тым, як у мастацкую тканіну твораў паэта з Краснаполля ўваходзіць зусім рэальны чалавек, быццё якога пададзена ў канкрэтным прасторава-часавым вымярэнні. Так, канец 1950-х гг. засведчыў творчае сталенне паэта. Паспрыяла, відаць, гэтаму і вучоба ў Маскве на Вышэйшых літаратурных курсах. Магчыма, вялікі горад, іншы свет і новае асяроддзе сталі прычынай таго, што так адкрыта, на розныя галасы загучалі ў лірыцы А. Пысіна словы «Магілёўшчына», «магілёўскі», «дняпроўскі». Гучна, на ўзнёслай ноце паэт спрабуе выказаць пародненасць з дарагім яму краем. Магілёўшчына для лірычнага героя верша «За палямі лугі і лясы...» – і маці, і сястра, і дняпранка, і працавітыя людзі, і інш. Сказана гучна і пафасна. Нестае яшчэ той характэрнай – пысінскай – суцішанасці слова пры ўнутранай напятасці эмоцый, няма той драматычнай цішыні, што абвастрае слых і зрок. Блізкія па танальнасці да названага твора і такія вершы, як «Краснаполле», «Магілёўскія дзяўчаты», «Першамайская вуліца», «Дзявочыя хусткі» і інш. І ўсё ж гэта было прадвесце: у тым жа 1958 г.

[1] *Пысін А.* Пазнач. твор. С. 329.
[2] Там жа. С. 41.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

паявяцца і такія характэрныя для пазнейшага А. Пысіна вершы, як «Вузел», «Перад фатографам жанчына...». Шлях да самога сябе – арганічнага, глыбокага, знешне някідкага, унутрана засяроджанага – быў даволі няпростым. Толькі са зборнікамі «Мае мерыдыяны» (1965) і «Твае далоні» (1967) прыйшло «адкрыццё» А. Пысіна прафесійнай крытыкай як арыгінальнага майстра слова.

Абвострана адчуваючы час і цяжар пройдзеных дарог, творца спяшаўся адбіць у мастацкім свеце аблічча кожнага, хто сеяў збожжа, аздабляў зямлю, бараніў яе ад ворагаў, расціў людскія душы святлом і цеплынёй, мудрым запаветам. І паэт патлумачыць, чаму яго радкі так густа населены людзьмі – з імёнамі і без. Пры гэтым яны заўсёды пададзены ў канкрэтных абставінах, з канкрэтнай «прапіскай» – у полі, лесе, лузе, на ўзбярэжжы рэчкі, ля крыніцы, у вясковай хаце, гародзе, бо яго землякі, суседзі, сябры, аднафамільцы, родныя прадстаўлялі свой час і здзейсненую ў часе правату:

Помню добрых людзей... Няхай
Будуць светла ўпісаны ў памяць[1].

З вершамі «Не пялёсткі ганак усцілаюць» (1960) і «Яшчэ мне верыцца, яшчэ мне верыцца...» (1960) у творчасць А. Пысіна ўваходзіць вобраз маці. Апошняе развітанне і вечнае расстанне далі адчуць, які «глыбокі корань радавы»[2]. Якраз у той трагічны час і прыйшло ўсвядомленае разуменне бясцэннасці скарбаў, што пакідаюць у спадчыну продкі: «Са мной душа і мова матчына // І песня вечная яе»[3]. Крок за крокам будуць вывучацца ўрокі роду, запаветы продкаў. Дыялог з маці стаў той неабходнасцю, без якой не мыслілася далей чалавечае і творчае жыццё («Дарагія сябры і суседзі...», «Жніво. Смуга над плёсам. Воз снапоў...», «У запозненым прызнанні...», «Лугоў зялёнае міжброў'е...», «Светла так на могілках і суха...», «Матчына чаканне» і інш.). Думка пра дабрыню, якой прамянілася душа маці, прымушае лірычнага героя А. Пысіна напружана шукаць адказ на пытанне, дзе ўзяць («намыць») тыя «залацінкі дабраты»[4], каб у свеце стала святлей і чалавечней. Зразумела, што патрэбны намаганні – і не абы-якія. Таму і гучыць так актуальна мацярынскі наказ сыну і ўсім жывым:

Прыпыні свой натомлены крок,
Не спяшайся ка мне, сынок.
Мне не будзе з табой весялей –
Дачакайся сабе дзяцей.

---

[1] *Пысін А.* Пазнач. твор. С. 328.
[2] Там жа. С. 83.
[3] Там жа. С. 84.
[4] Там жа. С. 196.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

На магілках трава і пясок –
Ціхі голас кранае слых:
– Вучы дабрыні ўнукаў маіх,
Не спяшайся ка мне, сынок...[1]

А ён спяшаўся. Спяшаўся сказаць сваім «адбеленым словам»[2] усё пра Магілёўшчыну, якою жыў і дыхаў, сказаць пра ўсіх, хто быў яму цікавы, блізкі лёсам, жыццёвай пазіцыяй. Часта згадвае ў апошняе дзесяцігоддзе свайго быцця мудрых дзядоў і бабуль: то гэта дзед Ярошка, то дзед, які «як лес»[3], то той, што «з жыццёвай спускаецца горкі»[4]. Прыгадвае бабуль, бабулек і бабулечак («Балада сагнутых бабуль», «На лавачцы сядзяць з вясны...», «Бабулька», «Маёй бабулі»). Помніцца і дзядзька Міхалап, які «жыццё правёў, як светлы спеў»[5].

Яшчэ ў 1972 г. (зборнік «Да людзей ідучы») паэт паставіў перад сабой задачу: весці мастацкую думку і лірычнага героя ў сучаснае жыццё сваёй радзімы. Ён прымусіў чытача прыняць магілёўскую гаворку, захапіцца талентам жанчын, што ўмеюць так па-мастацку трапна і ашчадна выяўляць у слове побытавую сітуацыю ці сваю рэакцыю на з'явы і падзеі. Нават падкрэсліць, што

У вёсак жаночыя назвы,
Бабулі, матулі для нас вы:
Малінаўка, Змітраўка, Горна,
І Мар'іна Буда, і Горка[6].

Можна прыгадаць і такія радкі:

Жалезніца, Касцягаўка і Горна,
І вёска маці – светлыя Мануйлы[7].

Гучаць і рэхам паўтараюцца назвы дарагіх А. Пысіну паселішчаў і ў вершы «Успомняцца – і адзавуцца...». Відаць, яны, гэтыя «густыя вёскі»[8], настолькі блізкія сэрцу паэта, што двойчы паўтараюцца ім – на пачатку твора і ў заключнай страфе:

Успомняцца – і адзавуцца,
Падступяць з чатырох бакоў
Падгор'і, Селішчы і Вусці,
І сотні палявых Баркоў. <...>

---

[1] *Пысін А.* Пазнач. твор. С. 360.
[2] Там жа. С. 195.
[3] Там жа. С. 250.
[4] Там жа. С. 248.
[5] Там жа. С. 306.
[6] Там жа. С. 341.
[7] Там жа.С. 272.
[8] Там жа. С. 238.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

I ўспомняцца, і адзавуцца
Таварышы-франтавікі,
Падгор'і, Селішчы і Вусці,
Падгор'і, Селішчы, Баркі[1].

Паміж пачаткам верша і яго апошняй страфой адлюстраваны вопыт франтавых дарог, падобнасць лёсу «і маршалаў, і радавых», аблічча тых, хто «застаўся ў памяці жывых», а яшчэ

I – асабістыя ўсё ж раны,
I – асабісты боль за ўсё[2].

Не пакідае адчуванне, што паэту радасна ўслухоўвацца ў гучанне знаёмых назваў, шукаць асобы сэнс і захапляцца, напрыклад, талентам спеўных жанок, што звязалі свой жыццёвы лёс з Панкратаўкай або Усцінавічамі. Не праміне ён і падкрэсліць характэрную для вясковых кабет «традыцыйна-фальклорную прыгажосць»[3], і перадаць сваё разуменне значнасці духоўных скарбаў продкаў, народнага этыкету і культурных традыцый, якімі кіруюцца спявачкі. Яны толькі «часам песню сваю вывозяць на людзі – у цэнтр абласны»[4]. За гэтым пысінскім «вывезці на людзі» песню чуецца і адказнасць, з якой спявачкі паказваюць сябе і сваю песню, і тое, што паездка ў раён, выхад на людзі – падзея, з'ява.

I як тут не прыгадаць словы В. Арцем'ева, з якім сябраваў паэт, пра стасункі А. Пысіна з народнай песняй, якая была для яго «вяршыняй, узорам паэзіі»[5]. Згадвае В. Арцем'еў і пра тое, што паэт і журналіст А. Пысін не толькі слухаў народныя песні, захапляўся іх акапэльным выкананнем вясковымі жанчынамі, але і «нястомна прапагандаваў народную песню і яе выканаўцаў сваімі нарысамі ў газеты і часопісы»[6]. Дададзім, і паэтычнымі творамі ў тым ліку. Сказанае В. Арцем'евым вельмі стасуецца, напрыклад, са словамі Я. Сіпакова, які пераконвае сучасніка ў тым, што «народныя спевакі зберагалі народную песню. А ўжо песня выратавала нашу мову, а яна, у сваю чаргу, дзяржаву, краіну, народ. Калі ёсць песня – значыць, жыве народ!»[7].

Вось і А. Пысін уражаны не толькі эмацыянальна-пачуццёвым дыяпазонам народнай песні, але і тым, што пры кожным новым выкананні яна

---

[1] *Пысін А.* Пазнач. твор. С. 238.
[2] Там жа.
[3] Там жа. С. 322.
[4] Там жа.
[5] *Арцем'еў В.* Паэт вузел завязаў : успаміны і роздум пра жыццё і творчасць А. В. Пысіна. Магілёў, 2008. С. 63.
[6] Там жа.
[7] *Сіпакоў Я.* Пазнач. твор. С. 105.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

«ў чысціні, ў харастве сваім абнаўляецца»[1]. І таму апраўдана ў мастацкім кантэксце паўторанае на розныя лады рытарычнае пытанне лірычнага героя, адрасаванае самому сабе і наступнікам, сусветнай пrasторы і часу: «Хто яна, хто яна, хто яна, // Першы паэт той, першая тая спявачка?»[2].

Вопыт абыходжання А. Пысіна з народнай песняй цікавы яшчэ і тым, наколькі змястоўна вядзе паэт размову пра месца і ролю песні ў фарміраванні духоўна-маральнага патэнцыялу грамадства. Так, з сярэдзіны 1970-х гг. слова «песня» або вытворныя ад яго часта выкарыстоўваюцца ў назвах вершаў («Даўняя песня дзявочая», «Спеўнае», «Успамін пра жніўную песню», «Заспявай, мой дружа, заспявай» і інш.). У свой час падобная з'ява была адметнай рысай мастацкага мыслення ранняга Я. Купалы. І калі для Купалы такія стасункі з народнай песняй былі найбольш выяўнымі ў першае дзесяцігоддзе літаратурнай дзейнасці, то ў пысінскай лірыцы дух народнай песні, яе духоўна-эстэтычныя біятокі асабліва значна, адкрыта заяўляць пра сябе напрыканцы творчага шляху паэта. Як вынік. Як падсумаванне, абагульненне пражытага і перажытага з народам і яго песняй.

Здараецца, у сваё мастацкае поле А. Пысін уключае вядомыя песенныя радкі або дасціпныя прыпеўкі («Чабарок, мой чабарок...», «Дарогай на Панкратаўку», «Даўняя песня дзявочая» і інш.). Кропку ў размове пра ачышчальную сілу народнай песні, пра яе ўнікальныя здольнасці яднаць родных і чужых, далёкіх і блізкіх А. Пысін паставіць у вершы «Харошкі» (1981). На розныя лады (да дзесяці разоў!) паўтараецца паэтам такая знакавая назва ансамбля – «Харошкі»:

«Харошкі» – чараў сувязны.
Ёсць над Дняпром сяло Харошкі.
«Харошкі» – з поля, з баразны,
«Харошкі» – з жыта, як валошкі[3].

Нават народнае выслоўе «і жнец, і шавец, і на дудзе ігрэц», мяркуе творца, ці не ў тых, што на Дняпры, Харошках нарадзілася. Сапраўды, з такімі «Харошкамі» нічога іншага не застаецца, як толькі харашэць. Душой, аблічам, думкамі. Таму і ўзгадвае А. Пысін у сваіх радках не толькі невядомых паэтаў і спявачак, але і многіх творцаў, каго выхавала Прыдняпроўе з яго багатым прыродным светам і народнымі духоўнымі скарбамі.

У пару творчай сталасці А. Пысін выказаў «Чынш прыязнасці людской…»[4] кожнаму, хто лёсам і справамі спрычыніўся да Магілёўскай зямлі.

[1] *Пысін А.* Пазнач. твор. С. 324.
[2] Там жа.
[3] Там жа. С. 385.
[4] Там жа. С. 273.

This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Ён удзячны ўсім, хто памнажаў духоўныя скарбы продкаў шчырым служэннем беларускаму слову. Напрыклад, яго душу прыемна грэюць успаміны пра тое, што ў навакольных вёсках і «аж дзесьці ў Саматэвічах» прыгадваюць Бялькевіча: «“Краёвы слоўнік” разам мы збіралі…»[1]. Многія вершы, напісаныя ў апошняе дзесяцігоддзе, з’яўляюцца «адраснымі» – маюць канкрэтныя прысвячэнні («Палёт», «Калі б вясне, Дняпру і чайцы…», «Падымаецца камочак песні…», «Заспявай, мой дружа, заспявай…», «Сцяжынкі лясныя стаптаны да дзір», «Лугоў зялёнае міжброўе…» і інш.). Здараецца, што і назву твору дае імя (прозвішча) рэальнай асобы – «Пятрусь Бядулін», «Вершы Міколы Сурначова», «Балада пра Фёдара Ракушава, запісаная ў вёсцы Ракушава Круглянскага раёна».

Нельга не заўважыць, наколькі таленавіта, з глыбокім адчуваннем трагізму жыццёвага і літаратурнага быцця тых, чый лёс дачасна абарваўся, вядзе свой роздум-рэквіем А. Пысін. Так, першаму вядомаму паэту Краснаполля Петрусю Бядуліну прысвячаецца ўсяго 20 радкоў, а за імі – жыццё чалавека: маленства, вучоба, першая публікацыя ў сталічным выданні, сталенне таленту і нарэшце – такі вось па-пысінску лаканічны і па-мастацку моцны заключны акорд-абагульненне:

І – зіма ў глыбіні франтавой.
І – акоп на шматочку планеты.
Той зімою
пісалі паэты
Па снягах, па марозе
крывёй…[2]

Вось так, ад верша да верша, доўжыць у слове А. Пысін кароткае жыццё П. Бядуліна ці А. Сербантовіча. Прымушае сённяшняга чытача прыняць душой прачулыя «вясновыя радкі» М. Сурначова. Таленавіта шчырымі радкамі прамовіць паэт да А. Куляшова, М. Стральцова, С. Гаўрусёва і інш.

Пра Магілёўскую зямлю, пра бацькоўскі край і яго духоўную спадчыну А. Пысін паспеў сказаць так значна, так праўдзіва і па-мастацку так высока, як мог, як умеў гэта рабіць толькі ён, паэт і чалавек Аляксей Васільевіч Пысін.

[1] *Пысін А.* Пазнач. твор. С. 372.
[2] Там жа. С. 312.

This document has been edited with Infix PDF Editor
- free for non-commercial use.
To remove this notice, visit:
www.iceni.com/unlock.htm